Яўгена ПЯСЕЦКАГА фота слова



Кажуць, будуць на Зямлі
цяжкія часіны —
Калі вырастуць з раллі
жалезныя хваіны,
З-за сталёвых крыл у неба
не праб'ецца сонца,
Стане дзень,
як крыха хлеба,
Стане ноч
бясконца...
Птушка гнездаваць
не будзе,
сціхнуць, знікнуць словы
І, нарэшце, счэзнуць людзі
Бо,
як жыць без мовы?
Кажуць, кажуць, але я
сам сабе мяркую:
Пасаджу ля рэчкі сад,
хату пабудую,
Будзе птахава сям'я
шчабятаць размову,
Будзе сонечна — і я
не змарную мову...
...Хтосьці кажа,
хтось маўчыць,
але час мінае
І жалезны лес здалёк
моўчкі наступае.

# ДОБРЫЯ ЛЮДЗІ

Нататкі мастака



### СКОРЫКАЎ І ШАНЕЦ

Сядзіш і не ведаеш, што з табою заўтра здарыцца. Ты мяркуеш, нібыта ведаеш, а насамрэч будучыня твая невядомая. Вось сядзеў я ў рэдакцыі і вычытваў эсэ пра жывапіс, калі падышоў мой непасрэдны начальнік і сказаў, што трэба ісці ў Палац спорту і там са сцэны верш прачытаць. «Які верш?» — «Разбярэшся!» Пайшоў. Гэта было ў тыя часы, калі я не абмяркоўваў загады начальніка. Сказалі ісці? Пабег. Сказалі верш чытаць? Выйшаў на сцэну і прадэкламаваў. Ну і што з таго, што ў зале было тысячаў з пяць народу, а мне давялося віншаваць баксёра, які прывёз на радзіму алімпійскую ўзнагароду, а вершаў пра бокс я ніколі не пісаў? Наогул, вершы пра спорт не складаю, пішу пра каханне, пра смерць і пра п'янства. Пра спорт? Ніколі. Спорт люблю, але вершы пра спорт — не мой стыль. Мяркую, баксёр не закрыўдаваў. Ну, павіншаваў яго паэт з перамогаю, нейкі там верш пра мужнасць прачытаў. Усё нармальна. Баксёру было б прыемней, каб яго павіншавала спявачка, але карта лягла інакш.

І калі з баксёрам у мяне ўсё атрымалася выдатна, то праграма са спеваком Скорыкавым дала збой. Уначы перад канцэртам яго пабілі. Скорыкаў планаваў, што выйдзе на сцэну і праспявае для вялікай аўдыторыі сваю красамоўную песню. Дзяўчаткі вынесуць букет, а ён падорыць кветкі алімпійскай чэмпіёнцы. Ён так гладка ўсё спланаваў, і адрэпеціраваў, і касцюмчык свой светлы пачысціў... Ды лёс, як я заўважыў, непрадказальны. Уначы перад канцэртам Скорыкава збілі. І крыўдна тое, што білі яго каля ўласнага дома. Спявак ішоў дамоў, яго перанялі дваровыя хуліганы і пачалася бойка, бо яны патрабавалі ў артыста грошы, а той не захацеў іх аддаваць. Ну і хто гэта захоча аддаць сваё чужым, кепска выхаваным людзям? Нават і добра выхаваным ніхто свайго запроста так не аддае. І атрымаў Скорыкаў кулаком у твар. Адказаць ён, вядома, адказаў, і бойку выйграў, што крыху суцяшае. Хуліганы паўцякалі. І можна было б святкаваць перамогу, каб не разбітая губа ды сіняк пад вокам. Каб той сіняк быў пад вокам баксёра, ці на крайні выпадак паэта, усе б зразумелі. А фінгал на твары ў саліста дзяржаўнага аркестра выглядаў недарэчна. І як артыст ні замазваў твар, а сляды бойкі выглядалі ярка. Я нават паспачуваў Скорыкаву. Ён стаяў за сцэнаю і пытаўся ў мяне, чаму яму так не шанцуе. А я не ведаў, і ніхто не ведае.

### ЛЕАНАРДА І СТОМА

Існуе легенда, нібыта Леанарда ніколі не стамляўся. Ён адно мяняў свае занняткі. Пасля малявання рабіліся інжынерныя праекты, заняткі граннем на цытры змяняліся вывучэннем анатоміі чалавека і прыдумляннем сцэнарыяў для розных урачыстасцяў і карнавалаў. Складана паверыць у поўную адсутнасць стомы ў якога з людзей. Але, разглядаючы спадчыну, пакінутую Леанарда з мястэчка Вінчы, можна паверыць не толькі ў адсутнасць у яго стомленнасці, а нават і ў тое, што ён і не чалавек зусім. Маё асабістае стаўленне да стомы фармулюецца так: варта пражыць столькі, каб мець магчымасць спакойна і шчыра сказаць: «Я стаміўся глядзець на свет».




### ПРАДАВАЧКА МАСАК І ГРОШЫ

Хто з нас не любіць карнавалы? А што за карнавал, калі ён без масак? А што за маска, калі яна не венецыянская? Нават калі навокал няма карнавала і да Венецыі кіламетраў з тысячу, а ты знаходзішся ў барселонскай краме венецыянскіх масак, табе робіцца весела. Ты весялішся, пакуль не даведаешся пра кошт. І ты папросіш у прадавачкі самую танную, неразмалёваную і непафарбаваную. Вырашыш прыдбаць белую маску. А прадавачка, яна ж і расфарбоўшчыца масак, пачне казаць, што белая маска не прадаецца, а толькі ўпрыгожвае вітрыну. Яе можна зразумець, бо белая маска каштуе 10 еўра, а расфарбованая 50, а калі з налепленымі чорнымі ці чырвонымі пёрамі, дык і ўсе 80. Нарэшце ты праўдамі і няпраўдамі ўгаворыш прадавачку саступіць табе сумна-белую маску, і яна саступіць тую простую маску з такім выглядам, нібыта саступіла табе частку сваёй цноты. Ты будзеш стаяць шчаслівы з венецыянскай маскаю ў руках, а з'едлівая прадавачка скажа, што той, хто адзене непафарбаваную маску і выйдзе ў ёй на вуліцу, будзе абавязкова абрабаваны і страціць усе грошы да апошняга еўрацэнта.

### САБАЧКА І ПРАКАТ

Што толькі ні прапаноўваюць узяць на пракат... Машына, яхта, ровар, скутар, парашут з прапелерам, скейтборд і ролікавыя канькі... Сотні самых розных механізмаў чакаюць цябе. Ды што там механізмы, розныя арганізмы можаш узяць на часовае карыстанне. На кані пакатацца? Калі ласка. Жанчына на гадзіну? Без праблемаў. І мужчыну бяры хоць на цэлую ноч. Плаці і бяры. Але я не хачу скакаць на кані па лясах і палях, і на скутары рассякаць хвалі жадання няма. Я хачу пагуляць з сабачкам уздоўж мора. Самым ранкам, яшчэ да ўзыходу сонца, хачу прайсціся па вільготнаму пяску, і яшчэ хачу, каб побач бег сабачка, каб ён то адставаў ад мяне, то забягаў далёка наперад, ну так, як звычайна гуляюць сабакі. Толькі сабак напракат не здаюць — няма такой паслугі.

### АНТОН І САМАКАТ

Дзядзька Антон прынёс са свайго завода два падшыпнікі і зрабіў мне самакат. З грукатам і лязгатам я ганяў яго па асфальту нашай местачковай вуліцы. Ганяў так, што ажно іскры выляталі з-пад бліскучых падшыпнікаў. Ганяў шпарка і спрытна, на зайздрасць сваім раўналеткам. Потым ад таго самаката ў мяне застаўся адзін падшыпнік, з якога я падаставаў шарыкі, каб страляць імі з дубовай рагаткі. Такі шарык мог прасадзіць дзве шыбы навылёт. Адзін сталёвы шарык пражыў у мяне даволі доўга. Ён праляжаў у шуфлядзе пісьмовага стала ледзь не да самага канца майго навучання ў сярэдняй школе, а потым некуды прапаў...

Па гладкаму асфальту чужы хлопчык гоніць новы самакат уздоўж берага Міжземнага мора. Седзячы на каменнай лаве, я гляджу на яго, згадваю дзядзьку Антона і сам сабе задаю пытанні. Што застанецца ў гэтага хлапца ад ягонага купленага самаката? І куды яно ўсё параскоціцца і папрападае? Ці згадае гэты чалавек праз сорак гадоў сваё лётанне на самакаце, сваю шпаркую язду ўздоўж марскіх хваляў? Мне ўсё роўна. Мяне, пэўна, ужо і не будзе на свеце. А мо і цябе не будзе, мой мілы таварыш чытач. А нейкі, зусім невядомы нам хлопчык гнацьмуць свой новенькі самакат, а марскі вецер абдуваць муць ягоны свежы твар.

**Адам ГЛОБУС.**

А на мой погляд...

# АДПУЖВАЕ ЗАЛІШНЯЯ АДКРЫТАСЦЬ У АДЗЕННІ ДЗЯЎЧАТ



***Пасля адноснай прахалоды ў пачатку—сярэдзіне ліпеня на нас зноў абрынулася спёка. Часам прыпякае так, асабліва ў горадзе, што няма паратунку: хочацца скінуць з сябе літаральна ўсё. Чым, дарэчы, многія і карыстаюцца, апранаючыся як мага лягчэй. Тым больш многія ўжо прыехалі з адпачынку і імкнуліся прадэманстраваць свой айчынны ці замежны загар. Толькі, падаецца, у гэтым сваім лагічным і заканамерным жаданні асобныя суайчыннікі пераходзяць пэўную мяжу: часам юнак, а часцей дзяўчына бываюць апрануты нібыта для паходу на пляж ці начную дыскатэку, але толькі не для выхаду ў горад ці нейкае грамадскае месца.***

***Як вы асабіста ставіцеся да такіх сітуацый: яны вас раздражняюць, не закранаюць увогуле ці напружваюць у пэўных сітуацыях?***

***Ірына КІСЛЯК, начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Капыльскага райвыканкама:***

— Дастаткова спакойна стаўлюся. Калі гэта прыгожыя маладыя людзі і ім зручна ў такой форме адзення, дык чаму б не? Тым больш у спёку, як вы заўважылі. Ці даводзілася сутыкацца з паўагаленымі наведвальнікамі на працы, пытаецеся. Напэўна не. Людзей, якія збіраюцца ў афіцыйныя органы ўлады, дысцыплінуе сам толькі гэты факт. А супрацоўнікі, падначаленыя — людзі сталага ўзросту, таму заўсёды апранаюцца карэктна.

***Сяргей СУБАТОВІЧ, участковы інспектар міліцыі Старадарожскага РАУС:***

— Калі малады чалавек з'яўляецца ў нейкім грамадскім месцы ў адных шортах, як кажуць, з голым торсам, гэта, з аднаго боку, яго асабістая справа. З другога, такая сітуацыя паказвае, наколькі ён паважае сябе і навакольных. Гаворка ідзе пра культуру паводзінаў. Не ўсім такое відовішча можа падабацца. Па службе я магу падысці, зрабіць заўвагу, але прымусіць чалавека апрануцца інакш нельга. Пры ўмове, што паводзіць ён сябе адэкватна. З п'яным, напрыклад, размова можа быць іншай — яго можна даставіць у райаддзел для разбору. А ўвогуле, заўважу, для тэрыторыі сельскага Савета, які я абслугоўваю, такія сітуацыі нехарактэрныя: у вёсках большасць людзей паводзіць сябе больш стрымана, чым, напрыклад, у вялікіх гарадах.

***Людміла ЧЭБАН, першы сакратар Глыбоцкага райкама БРСМ:***

— Усё залежыць ад таго, дзе даводзіцца назіраць такіх людзей. Калі гаворка ідзе пра нейкае сур'ёзнае мерапрыемства — пасяджэнне выканкама, пленум — тады адмоўна. Бывае выйдзе на сцэну чалавек у легкадумнай вопратцы, ці заўважыш такога ў зале, дык хочацца падысці і сказаць, што гэта некарэктна ў адносінах да іншых. А калі загарэлая дзяўчына ў лёгкім сарафанчыку ідзе па вуліцы, ці бачыш прыгожых людзей у лёгкай вопратцы ў летнім кафэ — няма праблем. У спёку цела павінна дыхаць. Калі мы выязджаем на нейкія культурныя мерапрыемствы, загадзя папярэджваем людзей наконт формы адзення, асабліва калі напярэдадзе наведванне мемарыяльных комплексаў ці храмаў. Усе ставяцца да гэтага з разуменнем, праблем ніколі не ўзнікала. Калі гаварыць пра маіх калег, падначаленых, то ўсе яны, асабліва кіраўнікі, з'яўляюцца ў гэтым плане прыкладам для астатніх.

***Лідзія ВЕЖНАВЕЦ, начальнік аддзела культуры УП «Гарадскія паркі «Мінскзеленбуда»:***

— Калі гаварыць пра супрацоўнікаў парку, яны не павінны хадзіць на працу пры гальштуках, але і шорты забаронены — у іх павінна быць лёгкае, зручнае адзенне. Дарэчы, амаль усе наведвальнікі таксама прытрымліваюцца гэтага правіла, паколькі прыходзяць адпачыць парамі або кампаніямі. Іншая справа — грамадскія месцы, той жа транспарт... Літаральна ўчора назірала малюнак: яркая сама па сабе дзяўчына была апранута ў абуральную, вельмі адкрытую чырвоную кофтачку. Адкрыла тое, што не трэба было адкрываць. Адмоўнай рэакцыя была не толькі ў мяне, але і ў маладых мужчын. Дарэчы, і ўрачы, і міліцыя ўвесь час папярэджваюць моладзь: каб не мець праблем, не апранайцеся так сэксуальна. Мы з калегамі нават звярнулі ўвагу: хлопцы ў парках больш цягнуцца да тых дзяўчат, якія не адкрываюць, а проста падкрэсліваюць свае вартасці. Прывабна ж можна выглядаць і ў закрытым адзенні. А адкрытасці, якая дэманструе даступнасць, пачалі нават палохацца. Галоўны ж рэцэпт, на мой погляд, просты: трэба глянуць на сябе ў люстэрка і падумаць, ці прыемна было б вам бачыць на іншым тое, што вы самі апранулі.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» ПРОВОДИТ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ АВТОМОБИЛЬНОЙ ТЕХНИКИ**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ**

**на 12-м открытом аукционе по продаже объектов республиканской собственности 26 сентября 2007 г.**

| № п/п | Наименование техники | Местонахождение объекта | Год выпуска | Пробег в км/ наработка в м/ч | Начальная цена продажи объекта (руб.) | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 1. | Автомобильный кран 9Т31М1 № 111085 на ш. Урал-4320 ш. 058135, дв. 927017 | г. Дзержинск в/ч 74962 | 1981 | 11933 км 1805 м/ч | 7 500 000 | 750 000 |
| 2. | Автомобильный кран 9Т31М1 № 104114 на ш. Урал-375 ш. 309480, дв. 998079 | г. Дзержинск в/ч 74962 | 1979 | 1952 км 25 м/ч | 7 000 000 | 700 000 |

**12-й аукцион** состоится в 11.00 26 сентября 2007 г. по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 4, ГО «Белресурсы».

Прием документов на участие в аукционе заканчивается в 17.00 24 сентября 2007 г. по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, комн. 618 РУП «Белспецконтракт».

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, резиденты Республики Беларусь и нерезиденты, оплатившие задаток. Физические лица обязаны предоставить паспорт и заполнить необходимые документы установленного образца. Юридические лица предоставляют необходимый пакет документов.

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи 27 сентября 2007 года.
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Все денежные расчеты производятся путем перечисления их на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012008660018 в Октябрьском отделении ОАО «БелПСБ» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код 357, УНП 101099370. **Без НДС.** Справки по тел.: (017) тел./факс 224-88-05.

**Наш адрес в Интернете: www.belspeckontrakt.com**
**e-mail: info@belspeckontrakt.com.**

# 70-37-00 ВАС СЛУХАЕ

**Раніцай і вечарам, днём і ноччу. Кругласутачна і бясплатна. Ужо чатыры гады, як ва ўпраўленні ўнутраных спраў Гомельскага аблвыканкама з'явілася новая служба — бюро рэгістрацыі няшчасных выпадкаў (БРНВ).**

Па гэтаму тэлефону любы жыхар можа звярнуцца, калі, скажам, знік той ці іншы чалавек. Шукаць яго самастойна раней было нязручна, бо паспрабуй абзваніць дзесяткі арганізацый, дзе б той мог апынуцца (бальніцы, выцвярэзнікі, раённыя аддзелы ўнутраных спраў). А так адзін тэлефонны званок, адзін запыт — і клопаты ляглі на БРНВ.

За гэтыя чатыры гады ў бюро звярнулася каля 2 тыс. чалавек, яго супрацоўнікі ўстанавілі месца знаходжання каля 400 грамадзян. Астатнія самі вярталіся дадому: нехта недзе загуляўся, а кагосьці і затрымалі...

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

**Страховой полис ЗАСО «Белнефтестрах» по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу (код формы 2РП, 2РН) серия НС 040000 *считать недействительным.***

## КАЛІ КАТАЦЦА, ДЫК З АЛЬПІЙСКАЙ ГОРКІ

Такую магчымасць хутка будуць мець жыхары Рэчыцы, бо зараз вядзецца мантаж канструкцыі, дастаўленай з Германіі. Атракцыён, якому могуць пазайздросціць жыхары іншых гарадоў рэспублікі, размесціцца на набярэжнай Дняпра і разлічаны на забавы ў любую пару года. Даўжыня спуску горкі — 270 метраў.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

КІРМАШ штотыднёвы рэкламны выпуск № 25 (557)

аддзел рэкламы 287-17-79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

# ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### Прадаецца

■ Дом 6х10 у в. Завушша Нясвіжскага раёна, участак 21 сотка, газавае ацяпленне.
Тэл.: 8-029-790-56-69, (8-01770) 44-284.

■ Катэдж, 40 км ад г. Ліда, каля р. Нёман, 18 тыс. у.а., тэрмінова, торг.
Тэл. 889-95-10.

■ Дом недабудаваны 8х9 з прыбудовай, прыгодны для перавозу, у в. Каменка Шчучынскага раёна.

■ Дом з г/п, вялікі ўчастак зямлі, 3 км ад г. Мядзел.
Тэл. (8-01797) 38-170.

■ Бытоўка памерам 9х2,8 м, форма аплаты — любая, магчымы варыянты.
Тэл. 8-029-583-89-64.

■ «Мерседэс-190» 1985 г.в. 2,0Д.
Тэл. 8-029-691-67-32.

■ «Форд мандэо» 1993 г.в. 1,8 б., седан, дагледжаны, 3 тыс. у.а., торг.
Тэл. 8-029-652-78-84.

■ «Форд-фіеста» 1997 г.в., выдатны стан.
Тэл. 8-029-704-22-86.

■ «ВАЗ-2105» 1984 г.в. у добрым стане, 750 у.а., торг.
Тэл. (8-01718) 55-6-73, 8-029-913-25-10.

■ «VW-Джэта» 1991 г.в. 1,6 Д, белы, шырокі бампер, добры стан, 3250 у.а.
Тэл. 8-029-756-54-07.

■ «Форд-эскорт» 1987 г.в. 1,6 Д., зялёны, люкс, добры стан, 1700 у.а., торг.
Тэл. 8-029-576-45-96.

■ Зварачны апарат 230/400 в. «Фартуна 818», Германія, новы.
Тэл. 8-029-692-26-78.

■ Козы рознага ўзросту, малако казінае.
Тэл. (8-01795) 23-908 (г. Слуцк).

■ Карова, 6 ацёлаў.
Тэл.: (8-01774) 58-461, 58-499.

■ Прычэп металічны г/п шэсць тон, матацыкл К-650.
Тэл. (8-01596) 39-724.

■ Панелі сценавыя, уцепленыя, для будаўніцтва дома, дачы 8 шт., хуткі мантаж у г. Узда.
Тэл. 8-029-691-67-32.

■ Спальня «Александрына», б/к.
Тэл. 8-029-704-22-86.

■ Касілка трактарная навясная, апырскавальнік трактарны, касілка конная.
Тэл. 8-029-881-50-16.

■ Біблія — 5 тыс. руб., набор паштовак і народных рэцэптаў.
Тэл. (8-0212) 96-31-62.

■ «Опель-кадэт» на з/ч.
Тэл. 8-029-704-22-86.

■ Трактар Т-40, прычэп.
Тэл. 8-029-774-49-81.

■ Пасека ў в. Васілёўшчына.
Тэл. маб. 856-63-51.

■ Маб. тэл. «Нокіа 6030», 110 у.а.
Тэл. (8-017) 276-18-74.

■ Бульбакапалка навясная 2-радковая, цана па дамоўленасці.
Тэл.: (8-01792) 55-725, 8-029-931-82-28.

■ Самаробны трактар 20 к.с. — 900 у.а.
Тэл. (8-01770) 35-363, пасля 15.00.

■ Плуг, культыватар, бароны да трактара.
Тэл. (8-01772) 39-294.

### Куплю

■ Кватэру 1-, 2-пакаёвую ў Мінску.
Тэл.: 8-029-732-42-59, 8-029-373-39-01.

■ Бульбакапалку.
Тэл.: (8-01717) 34-645, маб. 767-04-93.

■ Матаблок МТЗ.
Тэл. 8-029-774-49-81.

■ Матаблок і прычэп да яго.
Тэл. 8-029-564-62-70.

■ «VW-Пасат» В 3 1989—93 г.в., магчыма з невялікімі дэфектамі.
Тэл. 8-029-114-50-29.

■ Старыя фотаапараты, аб'ектывы, значкі і паштоўкі па фотатэматыцы.
Тэл. 8-029-850-17-29.

### Рознае

■ Мяняю 1-пакаёвую прыватызаваную кватэру ў Віцебску з тэлефонам на непрыватызаваную ў Віцебску ці Мінску.
Тэл. 8-029-947-62-63.

■ Мяняю дом у г. Стоўбцы, 8 сотак зямлі, 2 уваходы, газавае ацяпленне, вада, тэлефон, г/п, гараж, сад на кватэру ў г. Мінску.
Тэл. 8-029-271-88-04.

ЗВЯЗДА

**КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ**

**Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі**
**220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А.**

**АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ваша прозвішча, адрас, хатні тэлефон.**

**Тэлефон для даведак 287-17-79.**

Пашпарт серыя__________ № __________ Выданы__________

Подпіс__________ Дата__________

# Сёння

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.57 | 20.27 | 14.30 |
| Віцебск — | 5.44 | 20.20 | 14.36 |
| Магілёў — | 5.47 | 20.17 | 14.30 |
| Гомель — | 5.48 | 20.10 | 14.22 |
| Гродна — | 6.13 | 20.41 | 14.28 |
| Брэст — | 6.18 | 20.38 | 14.20 |

### Месяц

*Першая квадра.*
*Месяц у сузор'і Стральца.*

### Імяніны

***Пр.*** *Германа, Іосіфа. Леаніда, Мікалая, Мірона, Рыгора;*
***К.*** *Іааны, Казаміра, Францішка.*

# Надвор'е на заўтра




Няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў

# ...у суседзяў

| Горад | Тэмпература | Ападкі |
|---|---|---|
| ВАРШАВА | +24 — +26 °C | Без ападкаў |
| ВІЛЬНЮС | +29 — +31 °C | Без ападкаў |
| КІЕЎ | +28 — +30 °C | Без ападкаў |
| МАСКВА | +27 — +29 °C | Без ападкаў |
| РЫГА | +29 — +31 °C | Без ападкаў |
| С-ПЕЦЯРБУРГ | +19 — +21°C | |

# 21 жніўня

Дзве даты



**1968 год** — у ноч на 21 жніўня вайсковыя злучэнні СССР, а таксама войскі Балгарыі, ГДР, Венгрыі і Польшчы агульнай колькасцю 650 тыс. чалавек увайшлі на тэрыторыю Чэхаславакіі для падаўлення «Пражскай вясны».

**1862 год** — у Магілёве створана першае на Беларусі і адно з найстарэйшых на прасторах былога СССР Медыцынскае навуковае таварыства. Першы кіраўнік таварыства доктар медыцыны А. Грабоўскі ўдзельнічаў у 1867 годзе ў рабоце І Сусветнага медыцынскага кангрэса ў Парыжы. Таварыства надавала шмат увагі барацьбе з інфекцыйнымі захворваннямі, паляпшэнню санітарнага стану ў горадзе і губерні, арганізацыі медыцынскага абслугоўвання насельніцтва, азнаямленню ўрачоў з найноўшымі метадамі абследавання і лячэння.

Цытата дня:

***«Кароткае жыццё мы не атрымоўваем — мы робім яго такім; не бедныя мы жыццём, а карыстаемся ім марнатраўна. Жыццё доўгае, калі ўмела ім карыстацца».***

**Сенека.**

## УСМІХНЁМСЯ!

*Настаўніца сустракае былога вучня:*

*— Ну і чым ты зараз займаешся?*

*— Метэаралогіяй, Марыя Аляксандраўна.*

*— Та-а-ак... А быў жа такі чэсны, праўдалюбівы хлопчык.*

☺

**На вечарынцы расійскай буйной газавай кампаніі Рыкі Марцін восем разоў атрымаў бутэлькай шампанскага па галаве. Спявак заявіў, што падасць у суд, бо ў кантракце было толькі сем.**

☺

*— У чым перавага радыётэлефона?*

*— Працягласць жаночай размовы абмежавана разрадкай батарэек.*

☺

**— Доктар, я больш не магу вытрымліваць гэтую дыету. Уяўляеце сабе, я ўчора ледзь не адкусіла мужу вуха!**

**— Нічога страшнага. Падумаеш, усяго восемдзесят калорый.**

☺

*Курортнае.*

*Вы лічыце, што сёння з раніцы ціхае надвор'е без ветру?*

*А зараз паспрабуйце ўстанавіць парасон на пляжы...*





*Сардэчна віншую з 55-годдзем **Ігара Карнеевіча ДАМАСЕВІЧА** з в. Галынь. Жадаю моцнага здароўя, поспехаў у працы, шчасця і дабрабыту ў жыцці.*

**Вера,** *в. Галынь.*

*Дарагую любую ўнучку **Яўгенію Юр'еўну МІХАЙЛОЎСКУЮ** з в. Швабы віншую з днём нараджэння. Жадаю моцнага здароўя, цяпла і дабра, поспехаў у працы, шчасця ў жыцці.*

**Бабуля,** *в. Такаўшчына.*

*Сардэчна віншуем любую матулю і бабулю **Валянціну Паўлаўну ШАПЛЫКА** з в. Рэдкавічы з 70-годдзем. Жадаем здароўя без лекаў, дабра, спакою і доўгага веку.*

**Дочкі, унукі.**

*Віншуем паважанага **Уладзіміра Сямёнавіча ДАЛГАЛЫЧАНКУ** з 60-годдзем. Жадаем моцнага здароўя, шчасця і радасці ў жыцці.*

**Калектыў рэдакцыі газеты «Ленінскі сцяг».**

**У суд Любанскага раёна Мінскай вобласці** паступіла заява аб аб'яўленні памерлым **Галоўчыца Аляксандра Сяргеевіча,** 31 кастрычніка 1976 года нараджэння, ураджэнца в. Лопачоў Брод Любанскага раёна Мінскай вобласці, які да лістапада 2002 года пражываў у г. Любані па вул. 9 Мая, д. 45, кв. 2 Мінскай вобл. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Галоўчыца А.С., паведаміць іх суду Любанскага раёна (тэл. 54-4-65) Мінскай вобл. на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

**У суд Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці** паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак **Выбарнага Аляксандра Аляксеевіча,** 1947 года нараджэння, апошняе вядомае месца жыхарства — Растоўская вобласць, г. Красны Сулін, вул. Брацкая, 16/1, РФ, які ў 1999 годзе выехаў за межы Рэспублікі Беларусь і больш звестак аб ім няма. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Выбарнага А.А., паведаміць іх суду Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

**У суд Полацкага раёна і г. Полацка Віцебскай вобласці** паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак **Цішчанка Аляксандра Рыгоравіча,** 7 жніўня 1955 года нараджэння, ураджэнца г. Магілёва, апошняе вядомае месца жыхарства — г. Полацк, вул. Марыненка, 1а—34, апошняе вядомае месца знаходжання — г. Полацк. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Цішчанка А.Р., паведаміць іх суду Полацкага раёна і г. Полацка на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

**У суд Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці** паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак грамадзяніна **Гасілава Алега Ікмет Аглы,** 27 студзеня 1965 года нараджэння, ураджэнца горада Растова Расійскай Федэрацыі, апошняе вядомае месца жыхарства і знаходжання ў снежні 2005 года — горад Касцюковічы. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра грамадзяніна Гасілава А.І., паведаміць іх суду Касцюковіцкага раёна на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.
**html:** www.zviazda.by; www.zviazda.by/ru/main (*новая версія, якая тэсціруецца*)
**e-mail:** info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».**
**Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.**
**Тыраж 34.227 Індэкс 63850. Зак. № 4527. Нумар падпісаны ў 19.30.**
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12